**Авалоданне сінтаксісам**

Перыяд адна- і двухслоўных сказаў змяняецца з’яўленнем развітых сінтаксічных форм, якія могуць выконваць розныя функцыі: суб’ект-аб’екта (Кацця кідае мячык); прыналежнасць (Гэта туфлікі Каці); злучэнне (Я бачу шкарпэткі і калготкі); атрыбуцыі (Гэта святочная сукенка) і інш.

Авалоданне сінтаксісам (як і засваенне роднай мовы ў цэлым) знаходзіцца ў прамой залежнасці ад узроўню развіцця прадметна-практычнай і гульнявой дзейнасці дзіцяці, развіцця яго мыслення, зносін з дарослым і равеснікамі. Глыбокае даследаванне развіцця сінтаксіса ў дзяцей было праведзена В.І. Ядэшка.

Малодшыя дашкольнікі ў асноўнай масе авалодваюць дыялагічным маўленнем. Дыялагічнае маўленне не патрабуе складаных моўных адзінак. Таму ў маўленні дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту пераважаюць простыя сказы.

Далейшае паглыбленне ведаў аб наваколлі абумоўлівае ўскладненне сінтаксічных канструкцый у маўленні дзяцей. Ужо малодшыя дашкольнікі пачынаюць будаваць складаназалежныя сказы, у якіх адлюстроўваюцца сувязі і адносіны паміж прадметамі і з'явамі. Часцей за ўсё ўжываюцца складаныя сказы часу і дапаўняльныя. Структура гэтых сказаў яшчэ недасканалая: часта ў іх адсутнічае злучнікавая сувязь, яна замяняецца інтанацыяй, назіраюцца і парушэнні парадку слоў, асабліва ў даданым сказе: “А ў мяне зорка ёсць, на фронце даюць якую».

У сярэднім дашкольным узросце ў маўленні дзяцей па-ранейшаму пераважаюць простыя сказы, але структура іх ускладняецца: з'яўляюцца сказы з аднароднымі членамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Авалоданне пазасітуацыйна-пазнавальнай формай зносін прыводзіць да засваення дзецьмі складаназлучанымі сказамі з даданымі прычыны, параўнання, умоўнымі, праўда, апошнія ўжываюцца вельмі рэдка: «Мяне дожджык не замачыў, таму што я пад парасонам быў», «Калі з'есці, мама будзе плакаць». Па-ранейшаму назіраюцца выпадкі, калі злучнік у сказе прапускаецца («Пабудавала, вось, хатку і сказала, вось, не адчыняць нікому»), прапускаецца частка злучніка («Вось лопнуў шар у дзядзі, таму націснуў моцна»). Упершыню ў сярэднім дашкольным узросце дзеці выкарыстоўваюць у маўленні абагульняльныя словы перад аднароднымі членамі сказа: «Вось прынеслі новыя цацкі: коціка і сабачку».

У мове старэйшых дашкольнікаў павялічваецца колькасць развітых сказаў з аднароднымі членамі, аб'ём простых і складаных сказаў. К канцу дашкольнага дзяцінства дзіця авалодвае амаль усімі злучнікамі і правіламі іх ужывання. Павялічваецца колькасць абагульняльных слоў. Аднак у самастойным маўленні дзеці рэдка ўжываюць усе тыпы складаных сказаў, часта дапускаюць памылкі ў дапасаванні пры іх пабудове.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ